# МЕТАДЫ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ БЕЛАРУСАЎ

*Рулёва С.Р.*
***ВДУ імя П.М. Машэрава***

Народная педагогіка мае справу з чалавекам, носьбітам сваей этнічнай псіхалогіі, грунтуецца на культуры, якая прадстаўлена ў прадуктах матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці, сістэме нацыянальных норм узаемаадносін, традыцый, духоўных каштоўнасцей. З гэтага вынікае, што выхаванне і адукацыя, што адарваныя ад сваіх каранёў, этнасу, нацыянальна-культурнага падмурку, не даюць таго станоўчага эфекту, на які былі першапачаткова запраграмаваны. Сёння дзяржава звярнулася да пытання базіравання нацыянальнай сістэмы адукацыі і выхавання на этнакультурнай выснове, пасведчаннем чаму з'яўляецца "Канцэпцыя адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь". Грамадства ўсвядомлівае думку, што ўжыўленне асобы ў свой этнас немагчыма без захавання духоўнай культуры, якая праяўляецца ў мове, каштоўнасцях народных традыцый і педагогікі.

Кола нашай цікавасці—эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы беларусаў. Мы прапануем сваё бачанне праблемы і вылучаем наступныя групы метадаў:

*Метады, скіраваныя на фарміраванне непасрэднага пачуццёвага адбіцця рэчаіснасці ў свядомасці, здольнасці разумець, адрозніваць і засвойваць эстэтычныя з'явы знешняга свету.*

З першых дзён маленькага суправаджаюць песні і першыя ўнушэнні, перакананні даводзяцца з імі. Праз гульню працягваецца знаёмства з навакольным светам, больш актыўна фарміруецца і непасрэднае пачуццёвае адбіццё рэчаіснасці ў свядомасці. Гульні вучаць малых быць назіральнымі, развіваюць творчыя магчымасці, пачуццё прыгажосці, дапамагаюць засвоіць культуру свайго народа. Дзеці запамінаюць традыцыйныя формы правядзення святаў, набываюць веды пра крытэрыі ацэнкі грамадскай думкі. Яны актыўныя ўдзельнікі жыцця, таму дарослыя адчуваюць свой абавязак перадаць скарб ведаў, у тым ліку і эстэтычных, што і адбываецца з дапамогай з растлумачэння, унушэння, перакананння праз гутаркі, казкі, прыказкі. Казкі пераконваюць у перамозе дабра і прыгажосці. Найбольш эстэтычна прывабнымі рысамі народ надзяляе станоўчых герояў, каб падкрэсліць, унушыць думку аб непарыўнай еднасці дабрыні і прыгажосці. Беларускі народ бачыць прыгажосць чалавека ў працоўнай актыўнасці, што фарміруе традыцыю паказу фальклорнага героя як знешне прыгожага працоўнага асілка. Функцыя перакананння і ўнушэння выразна высвечваецца ў прыказках і прымаўках. У суадносінах з традыцыйнымі народна-педагагічнымі поглядамі яны ўслаўляюць прыгажосць працаўніка, сумленнага, высокамаральнага і добрага і адначасова асуджаюць антыэстэтычныя рысы чалавека.

*Метады, скіраваныя на фарміраванне эстэтычных перажыванняў.*

У народнай працоўнай творчасці ўвасабляюцца і праяўляюцца густ і духоўныя памкненні чалавека, што сфарміраваліся пад уплывам нацыянальных традыцый. Таму ўшанаванню належыць чалавек, што не проста завіхаецца па гаспадарцы, вядзе яе прыгожа, якасна. Аб гаспадару мяркуюць па двары, па хаце. Прыгожа, дагледжана, усё на сваім месцы—пачэстка. А калі не—грамадская думка не дасць спакою, экспрэсіўна выкажа свае адносіны. Прыклад і аўтарытэт, гутарка, практыкаванне, гульня—усё спрыяе фарміраванню эстэтычных перажыванняў.

*Метады, скіраваныя на арганізацыю эстэтычна значнай практычнай дзейнасці.*

Бацькі—прыклад і аўтарытэт, таму ад іх пераймаецца усё: як працаваць, святкаваць, паводзіць сябе з аднавяскоўцамі. Дзеці спачатку назіраюць, пераносяць вопыт назіранняў у гульні, потым пачынаюць працаваць самі. Іх прывучаюць да работ мэтаскіравана, паступова ўскладняюць заданні і абавязкова патрабуюць

прыгожага, стараннага, творчага выканання. Праца выліваецца ў спаборніцтва паміж моладдзю: хто з іх лепшы майстар.

Але не толькі станоўчыя эмоцыі, перажыванні поўняць чалавечае жыццё. Смерць чалавека, нясе глыбокія душэўныя пакуты родным памёрлага. Эмацыянальнасць выліваецца ў пэўную паслядоўнасць і эстэтыку абрадаў са сваей атрыбутыкай. Абавязкова прысутнічаюць галашэнні—фальклорны жанр, які мае сваю паэтыку, сімвалы і дапамагае ачышчэнню душы.

*Метады, што садзейнічаюць развіццю эстэтычнага густа, прывіццю эстэтычнай ацэнкі.*

Уплывае на развіццё эстэтычнага густу вусная народная творчасць. Існаванне ў песенным свеце, плыні прыказак і прымавак, замоў, казак развівае рытмагукавое пачуццё мовы. Кожны чалавек можа стаць аўтарам ці сааўтарам твора.

Грамадская думка ў форме ацэнкі ці загаду выносіць рашэнне па праблеме, з дапамогай прыказак і прымавак рэгулююць паводзіны чалавека. Гэты метад аказвае істотны ўплыў і на працу. Майстры імкнуцца зрабіць прыгожую рэч, з пэўнага матэрыялу, каб было зручна карыстацца. Паступова, шляхам параўнання сваей пра цы з эстэтычным ідэалам ідзе развіццё эстэтычнага густа, прывіваецца звычка эстэтычна ацэньваць рэчаіснасць. Вянец працоўных дзеянняў—святы. Да іх найбольш старанна прыбіраюць ў хаце, мыюцца самі, надзяваюць лепшае адзенне, скіроўваюць намаганні каб ўпрыгожыць быт. Беларусы надаюць увагу фізічнай прывабнасці чалавека. Каб быць прыгожымі, жанчыны ўжываюць прыродныя касметычныя сродкі: адвары траў, сокі, мёд; робяць магічныя дзеянні. Аднак, галоўнае: "Чым кабета стражэй, тым яна даражэй і прыгажэй", "Краса прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца".

*Метады, скіраваныя на арганізацыю эстэтычна значнай дзейнасці.*

Асноўны метад—агульная эстэтыка паводзін. Шмат народных правіл, звычаяў мае сэнс—упрыгожыць жыццё, даць маладым арыенцір: як рабіць лепш, каб было прыгожа. Кожны член вясковай суполкі павінен паводзіць сябе такім чынам, каб прыемна было і яму, і яго суседзям. Можна казаць пра традыцыйную эстэтыку быта, бо хатнія рэчы, падсобны інвентар, харчовыя прыпасы займаюць сваё месца, змяшчаюцца ў пэўнай паслядоўнасці і ўтвараюць функцыянальную і кампазіцыйную ўзаемасувязь. Адначасова народ разумее, што эстэтычна выхоўвае не проста прыгожае наваколле, а самі людзі, іх праца, бо вучыць не толькі заўважаць і любіць прыгожае, але і актыўна клапаціцца пра яго. Праз народную педагогіку праходзіць думка, што выхавацель павінен ведаць, што з'яўляецца прыгожым, эстэтычным; што ўяўляе сабой эстэтычны ідэал і шляхі набліжэння да яго; нарэшце, ён сам, учынкі, быт павінны быць эстэтычнымі, інакш кажучы, аб'ядноўвае імкненні, словы і справы чалавека. Зразумела, праца, як асноўны метад народнай педагогікі, стаіць у шэрагу першых. З яе дапамогай адбываюцца ўсе перамены: з'яўляюца і ўпрыгожваюцца вырабы, арганізуецца рэчаіснасць. Аб гэтым кажа народная мудрасць: "Як робіш, так і маеш", "Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра". Бацькі заўжды выступаюць прыкладам для сваіх дзяцей, усё добрае і ўсё благое—ад іх. Менавіта бацькі з'яўляюцца тым прыкладам, які садзейнічае ўзнікненню эстэтычна значнай дзейнасці. У сям'і дзеці бачуць праявы мастацкага аздаблення вырабаў, эстэтычных адносін, чуюць першыя патрабаванні, падмацаваныя работай бацькоў. Нават самае простае заданне малыя павінны выканаць прыгожа. Каб гэта атрымалася, прыёмы працы паказваюць родныя, тлумачуць, а потым і патрабуюць прыгожага выканання. Хутка далучаецца грамадская думка. Яе ўплыў на эстэтычна значную дзейнасць ідзе праз практычныя парады: "Думай з вечара, а рабі з рання", "За справу бярэшся—не бойся і не хваліся", "Чалавек без рамяства, як дзеўка без хараства".

Даведацца, хто добры гаспадар, гаспадыня, у каго залатыя рукі дапамагаюць спаборніцтвы. Кожнаму хочацца, каб пра яго ішла добрая пагалоска, бо яна паспрыяе добраму шлюбу, паважлівым адносінам аднавяскоўцаў. Таму любую работу імкнуцца зрабіць хутка, прыгожа і якасна.

Такім чынам, можна меркаваць, што ў беларускай народнай педагогіцы склалася пэўная сістэма метадаў эстэтычнага выхавання. Вывучэнне і творчае яе выкарыстанне, на наш погляд, дазволіць больш якасна будаваць работу па эстэтычнаму выхаванню младога пакалення, дапаможа ўжываць народныя традыцыі ў практыцы сямейнага, дашкольнага, школьнага жыцця, а таксама ў адукацыйна-выхаваўчым працэсе вышэйшых навуковых устаноў. Нарэшце, азначаная праблема вызначае новыя шляхі этнапедагагічных пошукаў і напрацовак.

## СПОСОБНОСТЬ ЛИЧНОСТИ К ПРЕОДОЛЕНИЮ ВНУТРЕННИХ КОНФЛИКТОВ В ПРОЦЕССЕ ОБРАЗОВАНИЯ И ВОСПИТАНИЯ

*В.С. Даукша*

***Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка, г. Минск***

Одной из гуманитарных дисциплин, которая выполняет образовательную и воспитательную функцию в высшем учебном заведении является психология. В процессе преподавания психологии в ВУЗе может быть полезным освещение вопроса преодоления внутренних конфликтов личности.

Личность представляет собой устойчивую систему социально значимых черт, обусловленных существующей системой общественных отношений, культурой и биологическими особенностями индивида. Внутриличностный конфликт, предполагает конфликтное взаимодействие двух и более сторон. В одной личности могут одновременно существовать несколько взаимоисключающих потребностей, целей, ценностей, интересов.

Значимый вклад в развитие внутриличностного конфликта внесли психологи В.Мерлин, В.Мясищев, Н.Левитов, Л.Славина. В.Мерлин рассматривает внутриличностный конфликт как "результат острого неудовлетворения глубоких и актуальных мотивов и отношений личности."

Внутриличностный конфликт представляет собой острое негативное переживание, вызванное затянувшейся борьбой структур внутреннего мира, отражающей противоречивые связи с социальной средой, и задерживающее принятие решения.

Переживание внутриличностного конфликта отличается от других типов переживаний тем, что: обычно представлено как психоэмоциональное напряжение; в нем выражается осознание личностью трудности данной ситуации; выражает процесс выбора, сомнения и борьбы; отражает перестройку ценностно-мотивационной системы личности.

Внутриличностный конфликт может иметь положительные и отрицательной последствия. Внутриличностные конфликты могут быть: конструктивными (продуктивными, оптимальными) и деструктивными (разрушающими личностные структуры человека).

Конструктивно преодолеваемый внутриличностный конфликт - это один из механизмов гармонизации личностного развития.

- Оптимальный внутриличностный конфликт рассматривается как основа морального развития. В основе совершения морального поступка находятся "больная совесть, которая побуждает человека действовать вопреки собственной выгоде и подниматься к высшим моральным ценностям.
- Позитивно разрешенные конфликты закаляют характер, формируют решительность, устойчивость поведения, независимость от случайных обстоятельств, способствую становлению стабильной направленности лич-